# Паэты Магілёўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі пра вайну і Вялікую Перамогу!

**Віншуем з днём нараджэння:**

8 мая – БЯЛОВУ Вольгу Юр'еўну
8 мая – СЕЎБА Ганну Канстанцінаўну
10 мая – КАЖАМЯКУ Аляксея Мартынавіча
24 мая – ПАДАБЕДА Мікалая Іванавіча

**Віншуем з юбілеем:**

8 мая адзначае 70-гадовы юбілей
БАЛДОЎСКІ Аляксандр Сцяпанавіч




**Алесь КАЗЕКА**

*Вечная память павшим!
Слава в веках живым!
Мы уходили с марша
В ярый огонь и в дым,
Чтобы своей Отчизне
Славу и честь нести,
Чтобы, во имя жизни,
Мир на земле спасти.
Стали легендой судьбы
Тех, кого с нами нет.
Встали другие люди
Вместо ушедших в свет.
В мире родных раздолий
Новая жизнь кипит.
Есть у Отчизны вольной
Меч и надужный щит.
Только не выжжет время
Память народа в прах.
Подвиг отцов и дедов
В наших живут сердцах.
Мы от забвенья фальши
Свято его храним.
Вечная память павшим!
Слава в веках живым!*

**Владислав КОВАЛЕВ**

## Бой на Буйничском поле

*– Покурим, что ли, перед боем?
Врага известен нам маршрут.
И вот со скрежетом и воем
На нас с крестами танки прут.*

*Огонь и солнце, и жарища,
И закипает в венах кровь.
Снаряды воют, пули свищут.
И рвется враг на Могилев.*

*– Горит фашистский танк, ребята!
– Иван, Карима прикрывай!
– Какой по счету? – Двадцать пятый!
– Вперед! – Пехоту отсекай!..*

*Огонь и солнце, и жарища,
Но не на шаг нельзя назад!
Снаряды воют, пули свищут,
И дым, и гарь, и сущий ад!*

*Уже подбит тридцать девятый.
Уже фашист пополз назад!..
Глядят усталые ребята,
Как танки свечками горят.*

*Огонь затих... да и жарища
К закату начала спадать.
Уже и враг по полю рыщет,
Своих спешит земле предать.*

*Ах, поле! Буйничское поле!
Июльский рыжий колосок
Мне шепчет, обожженный боем:
«Горячий выдался денек!»*

**Мікола МІНЧАНКА**

*Казалі мне ісціну гэту
Шчырыя, добрыя людзі:
Той, хто пабыў на вайне,
Ніколі аб ёй не забудзе.
Там пралівалася кроў
За нашу з табою свабоду.
Там страчана столькі сяброў,
Баліць і сягоння народу.
Мы не байцы,
А байцоў тых сыны.
Сёння звычайныя людзі.
Толькі як дзеці мінулай вайны
Дастойнымі праўнучраў будзем.*

**Віктар КУНЦЭВІЧ**

## В Брестской крепости

*Я в Брестской крепости,
На ранах
Твоих, родная Беларусь.
И утро с тишиною рядом,
И небо сыпануло градом...
И вот в подвале
Я и грусть.
Я в Брестской крепости,
На ранах...
Невидима флюидов нить –
В ней столько силы
Многогранной,
Такой отчаянно-желанной,
Что я услышал явно:
«Жить!»*

**Сергей РЫНКЕВИЧ**

## День Победы

*Весна и май. Гвоздики. Ветераны.
Прошло немало безмятежных лет,
Но боль осталась, ноют в сердце раны.
Давайте вспомним тех, кого уж нет...*

*Когда опять приходит День Победы,
Есть чувство некой собственной вины:
Вот, дескать, воевали наши деды,
А в мире неспокойно от войны.*

*Никто из нас за это не в ответе.
Да будет мирным мир, и дай-то Бог:
Пусть спят спокойно ночью внуки, дети,
И днем их не застанет лютый рок.
Пусть будет все по совести и чести,
Пусть люди внемлют искренним словам.
А потому давайте вспомним вместе
Всех тех, кто подарил Победу нам.*

**Мікола ЛЕЎЧАНКА**

## На вышыні герояў

*Зноў туман засцілае нізіны
У вячэрняй скразной цішыні,
Толькі пошчак чуваць салаўіны
Каля Лудчыцкай вышыні.
На пакатай вяршыні кургана,
У някідкай і строгай красе,
Постаць бачна старога Баяна
На нейтральнай цяпер паласе.
Ён сядзіць у баку ад дарогі,
Валадар нашых думак і мар,
Песняй мужнай адводзіць трывогі
Старажытны, былінны гусляр.
Гэта сіла народа, збавенне,
Моц краіны і слава яе,
Пра далёкае вызваленне
Тут, у полі жытнёвым, пяе.
Гімн усім камандзірам, салдатам,
Аб крывавых баях успамін.
Набліжалі яны гэту дату
Пад разрывы снарадаў і мін.
Як свісталі варожыя кулі,
Ды прыцэльна страчыў кулямёт...
Нашы хлопцы навекі заснулі
Сярод стогнаў людскіх і грымот.
Галаву нахіляе ў скрусе,
Моцна гуслі трымае свае,
Услаўляе народ Беларусі,
Нескаронасць і веліч яе!*

**Алена КІСЕЛЬ**

*– Мама! А кто этот дядька суровый и длинный?
Вон он, стоит там на фото и машет рукой.
– Это твой дед. Тот, который дошел до Берлина
И подарил нам сегодняшний этот покой.*

*– Мама, а что у него на груди за награды?
Там... «За-от-ва-гу»? (читаю пока по слогам...).
– Это за то, что он делал работу как надо.
Он был разведчик и вовремя видел врага.*

*Мама, а жалко – его я совсем и не помню.
Он был какой? Тут в глазах-то на фото – печаль...
– Знаешь ли, дочка, он был добродушным и скромным.
И о войне да Берлине все больше молчал.*

*Прошлое спит в фотографии. Правдой не колет...
Только в знакомых глазах, что навечно скорбят –
Юный ефрейтор. Он рацию стиснул до боли,
В тысячный раз вызывая огонь на себя.*

**Валянціна ГАБРУСЕВА**

*Гляджу «Баладу пра салдата».
Такі прыгожы, малады.
І неяк рада і не рада,
Што не было мяне тады.
Атака. Выбух на экране...
Трымціць у квецені вясна.
Па сёння незагойнай ранай
Баліць праклятая вайна.
Гляджу «Баладу пра салдата».
Мне рэжа вочы дым сівы,
Б'е ў сэрца, нібы з аўтамата:
«Матуля, я прыйду жывы!»
Ды не прыйшоў. Плывуць як рэкі
Гады. Салдата не забыць.
Якім жа слаўным чалавекам,
Якім жа бацькам мог ён быць!*

**Наталля АЗАРАНКА**

## Кавалерам посмертных наград

*Седину под пилотки заправив,
Стали в строй души павших солдат.
Получив в День Победы сто граммов...
Как от водки, хмелел майский сад!*

*Кавалеры посмертных наград
Так и замерли в строгих мундирах.
Поколений грядущих кумиры,
Озаренные светом лампад...*

*Грудь бойцов – охладевший гранит.
Им стоять, возвышаясь над миром,
Под минор пулеметного пира,
Жизнь Победе оформив в кредит.*

*Ставки их были так высоки!
Полубоги из плоти и стали.
Без внучат ныне дедами стали
Безбородые фронтовики!
Им был брошен безжалостно жребий:
Стать героем! В бессмертье шагнуть!
И для звезд не беречь свою грудь!
Пусть сверкают они в мирном небе!
За Любовь! За Страну! За Победу!*

**Жанна УСЦІНАВА**

## Перамозе. Трывожнае

*Вось і семдзесят пяць ёй...
Неўпрыкмет састарэць паспела.
Гасцяваць прыходзіць вясной
у майскай сукні ружова-белай.*

*Заціх брэх крыважэрных куль,
лямант скоранай хеўры, хіжае...
А ад песень яе дасюль
па ўсім целе бягуць дрыжыкі...*

*Цвёрдай стрымлівае рукой
хвалі хісткія з гневу мора,
толькі ў сэрца біцці – непакой,
як угледжуся ў яе зморшчыны.*

*Падрастаюць мае сыны...
Неспакоіца ў свеце рыкае.
Як упэўніцца, што яны
у пашчу новай бяды не рынуцца?*

*Пад пятою вайна не спіць:
шыпіць, дўжае, сіл убіраецца.
Як жа... чым жа яе забіць
і прыхільнікаў-гадаў зграю?!*

*У дзён віхуры, і з'яў, і падзей,
пакуль толькі трымаюць ногі,
я з трывогай буду глядзець
у твар старэючы Перамогі*

*і маліць, каб жыла заўжды,
сцераглася сыходу заўчаснага -
у яе праведныя сляды
Мір ступае з надзеяй
У ШЧАСНАЕ!*

**Мікалай САЛАЎЦОЎ**

## Вясна сорак пятага

*Была ты сведкаю жывою
У сорак пятым на вайне:
Баец, сцякаючы крывёю,
Ледзь-ледзь насустрач поўз вясне.
Глытаў не водар ён вясновы,
А пыл ад выбухаў і дым...
І так на мыліцах яловых
З вайны вярнуўся паўжывы...
Вясна ж – палеткамі, лугамі
Ішла з асколкамі ў грудзях.
Не спала ноччу з салаўямі,
З сяўнёй хадзіла на палях.
Квітнее край наш партызанскі,
Не чуцен свіст фашысцкіх куль...
Ды толькі ў хоры ветэранскім
Яшчэ я чую плач бабуль.*

Літаратурную старонку падрыхтавалі: Аляксандр Казека і Святлана Казека.